Пролетары! ўсіх краін, єднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 242 (311)
ПЯТНІЦА
18
КАСТРЫЧНІКА
1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАШЫРЫЦЬ ТЭМАТЫКУ ЛЕКЦЫЙ

Лекцыя з'яўляецца важнейшым звянэм у сістэме партыйнай прапаганды. Яна неабходна для самастойна вывучаючых гісторыю ВКП(б), літаратуру, усеагульную гісторыю і іншыя прадметы. Яна неабходна для ўсіх нашых кадраў, для рабочых, служачых, калгаснікаў і працоўных сялян-аднаасобнікаў.

ЦК ВКП(б) у сваіх пастановах аб прапагандысцкай рабоце даў указанні партыйным арганізацыям шырока разгортваць лекцыйную работу, увесці ў практыку арганізацыю адкрытых лекцый з невялікай платай за наведванне.

У нашай вобласці лекцыйная работа ў апошнія месяцы набыла значна большы размах. За ліпень—верасень месяцы лектарамі абкома партыі прачытана 125 лекцый, больш 100 лекцый арганізавана Беластоцкім і Гродненскім гаркомамі партыі. Дзесяткі лекцый прачытаны ў раёнах, сельскіх советах, калгасах і вёсках.

Зацікаўленасць насельніцтва да лекцый вельмі вялікая. Асаблівым поспехам карыстаюцца платныя лекцыі. У Едвабне на платнай лекцыі тав. Новікавай «Перамога ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі ў СССР» прысутнічала 250 чалавек. У Гродне на лекцыю «Гісторыя Заходняй Беларусі» прышло 300 чалавек. Платную лекцыю тав. Токарава аб міжнародным становішчы, якая чыталася ў Беластоцкім парткабінеце, праслухала 800 чалавек.

Станоўчым фактам з'яўляецца тое, што да чытання лекцый прыцягваюцца кадры партыйнай і совецкай інтэлігенцыі, якія працуюць на кіруючай партыйнай, совецкай і гаспадарчай рабоце. У Ломжы лекцыі чытае сакратар райкома партыі тав. Анісімаў, загадчык райана тав. Мураўёў, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Турлейскі. У Гродненскім раёне лекцыі чытае мясцовы ўрач тав. Рабіновіч і многія іншыя таварышы.

Бясспрэчна, што маладым лектарскім кадрам неабходна практычная дапамога. Гэту дапамогу перш за ўсё абавязаны аказаць ім аддзелы прапаганды і агітацыі гаркомаў і райкомаў партыі. Маладым лектарам неабходны парады вопытных лектараў. Напісаныя да чытання лекцыі трэба абмяркоўваць у аддзелах прапаганды, указваць на недахопы і выпраўляць іх. На жаль, у нашай вобласці гэта не заўсёды робіцца.

ЦК ВКП(б) у пастанове ад 16 жніўня 1939 года запісаў: «Устанавіць такі парадак, каб ні адзін лектар не дапускаўся да чытання лекцыі без папярэдняй праверкі аддзелам прапаганды абкома ці райкома партыі ступені падрыхтаванасці лектара». Гэта закон, які трэба выконваць. Але ў нас бываюць парушэнні гэтага ўказання ЦК партыі. Аддзелы прапаганды і агітацыі райкомаў у асобных выпадках без папярэдняй праверкі ступені падрыхтаванасці лектара дазваляюць яму чытаць лекцыю. Так, напрыклад, у Беластоку лектар тав. Хенін быў дапушчан чытаць лекцыю без папярэдняй праверкі яе аддзелам прапаганды гаркома партыі.

«Буйнейшым недахопам у прапагандысцкай рабоце,—запісана ў пастанове ЦК ад 16 жніўня, — з'яўляецца тая акалічнасць, што лекцыі па гісторыі партыі чытаюцца пераважна па першых раздзелах «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». А гэта азначае, што ў лекцыйнай рабоце аддзелы прапаганды і агітацыі часта раўняюцца не па перадавых, а па адстаючых у вывучэнні гісторыі партыі людзей. Тэмы лекцый не садзейнічаюць больш хуткаму прасоўванню ўперад таварышоў, самастойна вывучаючых «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Паслякастрычніцкі перыяд, які мае важнейшае значэнне ў гісторыі большэвіцкай партыі, амаль не асвятляецца ў лекцыях і астаецца не вывучаным».

Аддзел прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома партыі гэта важнейшае рашэнне ЦК не выконвае, парушае яго. Аналізуючы план лекцыйнай работы, мы бачым, што за жнівень—кастрычнік месяцы запланіравана лекцый па I раздзелу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)—2, па II раздзелу—7, па III—12, па V—6, па VI—3, па IX—адна, па XII—адна. Вывад сам сабой зразумелы для кожнага.

Тэматыка лекцый вельмі абмежаваная. Амаль зусім не чытаюцца лекцыі па літаратуры, геаграфіі, палітэканоміі, гісторыі народаў СССР, усеагульнай гісторыі. Гарком планіраваў у верасні адну лекцыю па літаратуры на тэму: «Талстой і яго эпоха», але яна была сарвана.

Гэты недахоп у значнай меры датычыцца і лектарскай групы абкома партыі. Па гісторыі народаў СССР лектарская група на кастрычнік месяц запланіравала толькі дзве тэмы: «Беларусь і Украіна ў XVI—XVII вяках» і «Аб рускім палкаводцу Суворавe». Другіх лекцый па гісторыі народаў СССР няма. На літаратурную тэму ўнесена ў план толькі лекцыя тав. Вольпе аб Адаму Міцкевічу. Зусім не чытаюцца лекцыі па палітэканоміі, геаграфіі старажытнай, сярэдняй і новай гісторыі.

Безумоўна, гэта не можа задаволіць нашага слухача. Патрэбны лекцыі на новыя і новыя тэмы. Трэба пашыраць тэматыку лекцый.

Днямі ў Беластоку закончыла работу навуковая сесія Акадэміі навук БССР. Лекцыі акадэмікаў чыталіся на многіх прадпрыемствах і ў калгасах на розныя тэмы. І ўсюды збіраліся поўныя аудыторыі слухачоў.

Вызвалены ад памешчыкаў і капіталістаў народ не хоча аставацца невукам; як да святла сонца, цягнецца ён да ведаў. Нашы партыйныя, совецкія і гаспадарчыя кадры адчуваюць штодзённую патрэбу ў лекцыях па ўсіх галінах навукі, эканомікі і культуры. Нам неабходны лекцыі на тэмы развіцця гаспадаркі і культуры ў нашай вобласці.

Набліжаецца вялікая гадавіна Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Неабходна арганізаваць цыкл папулярных лекцый для рабочых і сялян, азнаёміць іх з тым, як совецкі народ пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў перамог капіталізм, адстаяў заваёвы рэвалюцыі ад інтэрвентаў і пабудаваў соцыялістычнае грамадства.

Цяпер пачалася кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Лекцыйную работу трэба цесна спалучаць з падрыхтоўкай да выбараў. Неабходна тэматыку лекцый папоўніць спецыяльна лекцыямі для выбаршчыкаў на ўчастках. Лектарская група абкома партыі пачынанне ў гэтым напрамку зрабіла, прыступіўшы да падрыхтоўкі лекцый у сувязі з выбарамі ў мясцовыя Советы. Аднак гэтага мала. Кожнаму гаркому і райкому партыі, пярвічным партыйным арганізацыям трэба сур'ёзна падумаць над пытаннем арганізацыі лекцыйнай работы на выбарчых участках. Кожны горад, раён, ды і пярвічныя партыйныя арганізацыі маюць у сваім распараджэнні вялікую колькасць вопытных агітатараў, вырасшых на агітацыйнай рабоце. Не трэба баяцца даручаць найбольш падрыхтаваным і здольным з іх тэмы для лекцый і дакладаў. Неабходна скарыстаць настаўнікаў, урачоў, інжынераў. Пры канкрэтным кіраўніцтве аддзелаў прапаганды і агітацыі гаркомаў і райкомаў яны зробяць вялікую справу.

Лекцыйная работа ў нашай вобласці можа і павінна стаць на ўзровень патрабаванняў задач дня.

Стол даведак і кансультацый

Для лепшага абслугоўвання выбаршчыкаў у час выбарчай кампаніі пры Беластоцкім Доме партыйнай асветы працуе стол даведак і кансультацый штодзённа з 10 гадзін раніцы да 11 гадзін вечара.

Па-большэвіцку правядзем кампанію выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Падрыхтоўка да выбараў ў горадзе Беластоку

Па выбарах у абласны совет дэпутатаў працоўных арганізуецца ў горадзе Беластоку 8 акруг. Дзяленне на акругі праведзена і перададзена на зацвярджэнне аблвыканкома. Распрацоўваецца падзел горада на выбарчыя ўчасткі, якіх будзе 67. Тэрытарыяльнае дзяленне горада па выбарах у абласны совет дэпутатаў працоўных будзе ў асноўным супадаць з акругамі і ўчасткамі, якія існавалі ў час выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Па выбарах у гарадскі совет будзе створана каля 250 акруг.

Горвыканком вылучыў работнікаў па складанню карты выбарчых акруг і ўчасткаў. Падбіраюцца людзі ў састаў брыгад па складанню спіскаў выбаршчыкаў. Брыгады будуць 18 кастрычніка праінструктыраваны, пасля чаго неадкладна прыступяць да сваёй работы.

Грамадскія арганізацыі вылучаюць ужо сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі. Па пытанню аб падрыхтоўцы да выбараў гарком партыі правёў нарады сакратароў пярвічных партарганізацый і комсамольскіх арганізацый. Заўтра адбудзецца нарада членаў фабзаўкомаў. Падбіраюцца кадры агітатараў, якіх будзе каля трох тысяч чалавек.

Выбары ў мясцовыя Советы маюць велізарнае значэнне. Яны ўцягваюць у палітычнае жыццё новыя слаі насельніцтва. У састаў горсовета будзе выбрана 250 членаў. Шырокі састаў горсовета дасць магчымасць палепшыць работу па культурна-бытавому абслугоўванню насельніцтва. Будзе створана магчымасць аказаць дапамогу органам народнай асветы, аховы здароўя. Дэпутаты горсовета будуць таксама ажыццяўляць неабходны грамадскі кантроль над асваеннем капіталаўкладанняў па будаўніцтву комунальных прадпрыемстваў і над прыцягненнем сродкаў гаспадарчых і кааператыўных арганізацый да гэтага будаўніцтва.

Але самае важнае — гэта палітычнае выхаванне працоўных горада і іх дэпутатаў у працэсе выбараў і работы ў горсовеце. Няма і не можа быць лепшай школы, як актыўны ўдзел у дзяржаўным, гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

Н. Марковіч.

Мітынгі і сходы ў Ваўкавыскім раёне

ВАЎКАВЫСК. **(Ад нашага карэспандэнта).** Працоўныя Ваўкавыскага раёна з вялікім задавальненнем сустрэлі Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Увечары 15 кастрычніка на прадпрыемствах, у калгасах і вёсках адбыліся многалюдныя мітынгі і сходы, прысвечаныя пачатку выбарчай кампаніі.

На мітынгу рабочых мясакамбіната начальнік цэха тав. Хілко заявіў:

— Урадам рэспублікі аб'яўлены першыя выбары ў мясцовыя органы совецкай улады. Выбары будуць праводзіцца на аснове Сталінскай Канстытуцыі, пад сонцам якой мы зажылі шчаслівым і радасным жыццём. Наш рабочы калектыў сустракае дзень выбараў як усенароднае свята. Мы абавязуемся выканаць гадавы вытворчы план да 15 снежня.

З вялікім уздымам прайшоў сход калгаса «Ударнік» Роскага сельсовета. Пасля даклада аб пачатку выбарчай кампаніі выступіў калгаснік Сцяпан Кухта:

— Наш калгас,—гаворыць тав. Кухта,—паспяхова заканчвае гаспадарчы год. Калектыўная праца дала выдатныя рэзультаты. На працадзень мы атрымаем не менш 3 кілограмаў зернавых і па 8 кілограмаў бульбы. На выбары мы пойдзем у адзіным блоку комуністаў і беспартыйных, выберам у мясцовыя Советы лепшых прадстаўнікоў народа.

Д. Казлоў.

ПРАЦОЎНЫЯ СЯЛЯНЕ ВІТАЮЦЬ ПАЧАТАК ВЫБАРАЎ

Працоўныя Монькаўскага раёна з вялікім уздымам і радасцю сустрэлі Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях. З 15-га кастрычніка ў вёсках раёна праходзяць многалюдныя мітынгі і сходы сялян, прысвечаныя абмеркаванню Ўказа.

На сходах і мітынгах калгаснікі і аднаасобнікі бяруць на сябе абавязацельствы ў бліжэйшыя дні поўнасцю закончыць асеннія палявыя работы і выканаць абавязацельствы перад дзяржавай па загатоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў. У раёне паспяхова праходзіць уборка бульбы, поўнасцю выканан план падняцця зябліва. Усе тры калгасы Монькаўскага раёна закончылі палявыя работы і здачу бульбы дзяржаве.

У райкоме партыі адбылася нарада кіраўнікоў агіткалектываў і лепшых агітатараў. 28 чалавек выехалі ў вёскі, дзе прыступяць да агітацыйнай работы.

В. Гарбанёў.

Выбары ў мясцовыя Советы яшчэ больш умацуюць нашу краіну

У прасторнай сталовай камбіната сабраліся пасля заканчэння зменнай работы ткачы і прадзільшчыкі, снавальшчыкі, інжынерна-тэхнічныя работнікі, каб вітаць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб дні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных заходніх абласцей БССР.

Сакратар партыйнай арганізацыі тав. Глухоўскі адкрывае мітынг. Ён расказвае аб надыходзячых выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных.

— Выбарчая кампанія і выбары ператворым ва ўсенародную дэманстрацыю совецкага патрыятызма, — гаворыць тав. Глухоўскі.

Гарачыя апладысменты сабраўшыхся падцвярджаюць яго словы.

Затым на польскай мове выступае брыгадзір фарбавальнага цэха тав. Венцлаўскі. Яго прамова гарачая і ўсхваляваная.

— Выбары ў мясцовыя советы,— гаворыць тав. Венцлаўскі, — яшчэ больш умацуюць совецкую ўладу, тую ўладу, якая пазбавіла нас ад жахаў вайны, ад смяротнаносных бомб, якая дала нам мірнае і радаснае жыццё. Вось чаму кожны рабочы, кожная работніца, усе працоўныя будуць актыўна ўдзельнічаць у выбарах у мясцовыя советы.

Слова бярэ стаханаўка прадзільнага цэха тав. Зубрыцкая.

— Што нам дала совецкая ўлада?—Яна нам дала свабоду, правы. Цяпер мы людзі працы, гаспадары самай магутнай у свеце краіны соцыялізма. Азнаменуем выбарчую кампанію перавыкананнем сваіх вытворчых планаў, павелічэннем ліку нашых стаханаўцаў.

— Пашлём у мясцовыя Советы сваіх лепшых, праверaных людзей, якія будуць стаяць за нашы інтарэсы, за інтарэсы працоўнага народа, — гаворыць у сваім выступленні рабочы тав. Рачынскі.

Ён заклікае павысіць класавую пільнасць, каб ніякія ворагі не маглі нам перашкодзіць у правядзенні выбараў.

Мітынг скончан. Аднагалосна прымаецца рэзалюцыя, у якой рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічны персанал запісалі:

«Паспяхова разгорнем перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва і з чэсцю выканаем узятыя намі абавязкі для дастойнай сустрэчы гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Калектыў работнікаў 5-га камбіната абавязуецца ўзмацніць і расшырыць палітычна-масавую работу сярод выбаршчыкаў на сваіх былых выбарчых участках».

Гарачы водгук працоўных

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** 14-га кастрычніка працоўныя нашага раёна даведаліся з газет аб Указе Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Увечары ў Граеве адбыўся агульнагарадскі мітынг. З яркай прамовай на польскай мове выступіў лепшы агітатар у раёне тав. Чэслаў Сканецкі. Ён сказаў:

— Рашэнне аб выбарах выклікае самы гарачы водгук сярод вызваленага народа. Ужо год мы жывём пад сонцам самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. За гэты кароткі тэрмін наша жыццё змянілася непазнавальна. Мы цяпер свабодны і зажылі шчаслівым жыццём. Уступаючы ў выбарчую кампанію, мы прыкладзем усе намаганні для таго, каб у дзень выбараў яшчэ раз прадэманстрыраваць сваё маральна-палітычнае адзінства, сваю любоў і адданасць да нашай соцыялістычнай радзімы, партыі большэвікоў і правадыра народаў таварыша Сталіна.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі прысутныя абавязаліся адзначыць пачатак выбарчай кампаніі новымі вытворчымі перамогамі і дасягненнямі ў сваёй паўсядзённай рабоце.

Многалюдныя мітынгі, сходы рабочых, служачых, калгаснікаў і сялян-аднаасобнікаў адбыліся па ўсяму раёну.

Сустрэнем дзень выбараў выкананнем гадавой праграмы

ЛОМЖА. **(Ад нашага карэспандэнта).** Як толькі быў атрыман Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі завода сельскагаспадарчых машын сабраліся на мітынг. З велізарнай увагай быў заслухан тэкст Указа. Пасля зачыткі слова ўзяў майстар ліцейнага цэха завода т. Бароўскі. Ён гаворыць:

— Мы будзем галасаваць свабодна на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. Мы прымем самы актыўны ўдзел у выбарах. Аднадушна прынята рэзалюцыя, у якой рабочы калектыў абавязаўся сустрэць дзень выбараў датэрміновым выкананнем гадавой вытворчай праграмы.

П. Грышчанка.

Па Совецкай краіне



Горад Вільнюс (Вільня) дзейна рыхтуецца да прадстаячага пераезду Ўрада Літоўскай ССР у старажытную сталіцу краіны. Усюды ідзе рамонт дарог, будынкаў, разбіваюцца новыя скверы і газоны.

На здымку: работы па ўпарадкаванню цэнтральнай плошчы горада. Фота Д. Чарнова. Фота ТАСС.

ВЫДАННЕ ТВОРАЎ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Совецкая грамадскасць адзначае ў лістападзе гэтага года 85-ю гадавіну з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. У сувязі з гэтым Дзяржаўнае літаратурнае выдавецтва прыступіла да падрыхтоўкі чатырохтомнага збору твораў паэта. У выданне ўвойдуць усе асноўныя вершаваныя творы Міцкевіча, літаратурна-публіцыстычныя артыкулы, выказванні аб ім сяброў і сучаснікаў (Пушкіна, Вяземскага, Жорж-Занд і інш.). Гэта першае найбольш поўнае выданне твораў Міцкевіча, прадпрымаемае пасля рэвалюцыі.

Вершы і паэмы Міцкевіча будуць даны ў новых перакладах. Аднаўляюцца купюры, зробленыя ў свой час у некаторых яго творах па патрабаванню царскай цэнзуры.

Для азнаямлення шырокага чытача з творчасцю Міцкевіча ў пачатку 1941 года намечана выданне масавым тыражом аднатомніка выбраных твораў паэта.

БІЯГРАФІЧНЫ ФІЛЬМ АБ ЛЕНІНЕ

КУЙБЫШЭЎ. Ва Ульянаўску закончыліся кіноз'ёмкі месц, звязаных з жыццём В. І. Леніна. Засняты ўнутраная абстаноўка дома-музея В. І. Леніна і любімыя месцы адпачынку сям'і Ульянавых.

З'ёмкі зроблены таксама ў Куйбышэўскім доме-музеі В. І. Леніна, у Казані, Ленінградзе і іншых гістарычных месцах, дзе праходзіла жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць Владзіміра Ільіча.

ВЫБАРЫ Ў СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ КАРЭЛА-ФІНСКАЙ ССР

ПЕТРАЗАВОДСК. (ТАСС). Прэзідыум Вярхоўнага Совета Карэла-Фінскай ССР выдаў Указ аб назначэнні выбараў у раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных Карэла-Фінскай ССР на 15 снежня 1940 года.

Пачатак выбарчай кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных Карэла-Фінскай ССР аб'яўлен з 15 кастрычніка 1940 года.



Калгас «Маяк соцыялізма» (Барысаўскі раён, Мінскай вобласці) у гэтым годзе сабраў багаты ўраджай. На працадзень калгаснікі атрымаюць па 4 кілограмы зернавых, па 10 кілограмаў бульбы, па 2 кілограмы гародніны, па 3 рублі грашыма. На здымку: калгаснік В. Г. Нечаеў (справа), які з жонкай выпрацаваў за 8 месяцаў 800 працадзён, атрымлівае авансам тону жыта.
Фота І. Шышко.

Фотахроніка БЕЛТА.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПАРТЫЙНАЯ РАБОТА—АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА ІНСТРУКТАРА

Інструктар — цэнтральная фігура партыйнага апарата. Ён з'яўляецца тым звяном, якое звязвае партыйны орган з пярвічнымі партыйнымі, савецкімі і гаспадарчымі арганізацыямі. Гэта вызначае ролю і задачы інструктара гаркома, райкома партыі.

Адсюль следуе, што чым паўней інструктар вырашае свае задачы, тым мацней раённы ці гарадскі партыйны камітэт звязан з нізавымі арганізацыямі, тым лепш партыйны орган ведае станоўчы вопыт у рабоце гэтых арганізацый, своечасова заўважвае і папярэджвае памылкі, выпраўляе недахопы асобных арганізацый, наладжвае абмен вопытам іх работы, перадае яго з адной арганізацыі ў другую.

Гэтыя патрабаванні абавязваюць партыйныя органы падбіраць на работу інструктараў такіх таварышоў дзелавыя і палітычныя якасці якіх дазваляюць ім паспяхова спраўляцца з вялікімі задачамі, ускладзенымі на іх.

Пярвейшая задача партарганізацыі раёна і горада таму заключаецца ў тым, каб інструктару гаркома, райкома стварыць неабходныя ўмовы для сістэматычнай работы над павышэннем сваіх тэарэтычных ведаў, для таго, каб інструктар меў магчымасць адначасова з палітычнай літаратурай чытаць і мастацкую літаратуру, рэгулярна чытаць газеты і журналы. Клопаты аб гэтым павінны ўзяць на сябе загадчыкі аддзеламі, сакратары гаркомаў і райкомаў партыі.



Сакратар партыйнай арганізацыі 17-й тэкстыльнай фабрыкі Д. В. Жукаў кансультыруе па гісторыі партыі стаханаўца М. Я. Белагурскага.

Фота А. Сапіра.

Зразумела, што адной работы над сабой яшчэ недастаткова. Такое разуменне справы было-б аднабокім. Патрэбна расшырэнне агульнага і палітычнага кругазору інструктара спалучыць з другой стараной пытання—неабходнасцю паляпшэння яго практычнай работы.

Трэба мець на ўвазе, што інструктар не можа паспяхова справіцца з сваімі задачамі, калі яго гэтаму не будуць вучыць кіраўнікі — загадчыкі аддзеламі, сакратары гаркомаў і райкомаў.

Якія якасці павінны быць прывіты інструктару ў першую чаргу? Патрэбна навучыць інструктара працаваць па плану. Гэта дасць магчымасць яму выдзяляць і ставіць перад сабой не ўсе пытанні. а галоўныя. Прывучыць яго часцей бываць у пярвічных партарганізацыях, лепш ведаць дэталі іх работы. працаваць з пярвічнымі арганізацыямі не наогул, а канкрэтна.

Але мала прад'явіць такія патрабаванні інструктару. Неабходна суправаджаць іх кантролем за яго работай з боку кіраўнікоў. Неабходна адначасова сістэматычна знаёміць інструктараў з указаннямі вышэйстаячых партыйных органаў, даваць ім рад парад у рабоце. Усё гэта, безумоўна, будзе садзейнічаць таму што інструктар у сваёй рабоце праявіць павышаную адказнасць за даручаны ўчастак, хутчэй будзе вырашаць актуальныя пытанні, своечасова паставіць найбольш важныя з іх перад гаркомам ці райкомам партыі.

Аднак, такая сістэма работы інструктара ў радзе райкомаў партыі нашай вобласці яшчэ ігнарыруецца. Большая колькасць інструктараў ператвараецца ў пастаянных упаўнаважаных па розных гаспадарча-палітычных кампаніях або асобных даручэннях. У гэтым выпадку інструктары дзевяць дзесятых свайго рабочага часу знаходзяцца ў раёнах, на сяле, не працуюць над сабой, адрываюцца ад пярвічных партарганізацый, не ведаюць іх работы. іншы раз не маюць магчымасці нават сігналізаваць свайму партыйнаму органу аб сур'ёзных недахопах у рабоце пярвічных арганізацый.

Інструктар Беластоцкага райкома партыі тав. Шэмялёў працуе ў райкоме з студзеня 1940 года. Да яго прымацаваны чатыры пярвічных партарганізацыі. Амаль увесь час ён знаходзіцца на вёсцы ў якасці упаўнаважанага раённых арганізацый. Над сабой не працуе, прыступіў да вывучэння толькі першага раздзела «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», мастацкай літаратуры не чытае. У сваіх пярвічных партарганізацыях бывае рэдка, дэталёва іх работы не ведае.

Такіх прыкладаў многа. І ўсе яны гавораць аб тым, што некаторыя партыйныя органы не зразумелі ролі інструктара, звужаюць аб'ём і задачы яго работы.

Якія асноўныя задачы павінны быць пастаўлены перад інструктарам парторганаў? Што патрэбна пераглядзець у існуючай практыцы іх работы?

Раней усяго неабходна ўсвоіць, што інструктар не ўпаўнаважаны па розных кампаніях, а важная адзінка, якая звязвае партыйны орган з пярвічнымі арганізацыямі. Галоўная задача інструктара — партыйная работа, якую ён не толькі правярае, але і арганізуе. Таму інструктар дзве трэці свайго часу павінен знаходзіцца ў пярвічных партыйных арганізацыях.

У цэнтры ўвагі інструктара павінен быць член партыі, яго рост, павышэнне авангарднай ролі на вытворчасці і ў грамадска-палітычным жыцці. На бліжэйшы адрэзак часу інструктар сваю работу і работу пярвічных партарганізацый павінен падпарадкаваць самай галоўнай. рашаючай задачы сённяшняга дня —разгортванню глыбокай партыйна-палітычнай работы ў масах, асабліва зараз, калі партыйныя арганізацыі вобласці ўступілі ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Усе інструктары партыйных органаў павінны быць прымацаваны да адпаведных пярвічных партарганізацый, што ліквідуе абязлічку ў іх рабоце. дасць магчымасць унікаць у гаспадарчае і культурнае жыццё прадпрыемства, сельсовета, соўгаса, калгаса.

Перад кіраўнікамі гарадскіх і раённых партыйных арганізацый стаіць задача: сістэматычна працаваць з інструктарамі, перыядычна праводзіць нарады, гутарыць з імі для таго, каб арганізаваць абмен вопытам і знаёміць іх з чарговымі задачамі партыйнай работы.

С. САРОКІН,

наместнік загадчыка оргінструктарскага аддзела абкома КП(б)Б.

РОСТ ГРОДНЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

ГРОДНА. (**Ад нашага карэспандэнта**). Партыйная арганізацыя Гродна за перыяд з 1 студзеня да 1 кастрычніка прыняла ў свае рады 14 чалавек у кандыдаты ВКП(б) і 29 чалавек з кандыдатаў у члены ВКП(б).

Прынятыя ў партыю — перадавыя, палітычна падрыхтаваныя людзі, якія праявілі сябе на рабоце, канкрэтнымі справамі даказалі сваю адданасць партыі Леніна —Сталіна.

У кандыдаты партыі прынят лепшы аглядчык вагонаў дэпо тав. Далматоўскі. Ён акуратна і добрасумленна выконвае ўсе даручэнні партыйнай арганізацыі, праводзіць гутаркі і чыткі газет сярод рабочых. Тав. Далматоўскі сур'ёзна працуе над павышэннем свайго тэарэтычнага ўзроўню, самастойна вывучае «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

З кандыдатаў у члены партыі прынята Марыя Шаціла. Яна 8 год працавала на магілёўскай фабрыцы штучнага шоўку, а зараз працуе ў гарадскім аддзеле народнага камісарыята ўнутраных спраў. Па даручэнню партарганізацыі тав. Шаціла праводзіць работу сярод жанчын.

У ліку прынятых у кандыдаты ВКП(б)—настаўнік школы № 5 тав. Левін. Усе вучні па яго прадмету паказалі добрыя веды. Ён актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці школы.

Г. Лупсякоў.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

МАЛАДЫЯ БАЙЦЫ

Стройны камандзір з ордэнам Чырвонага сцяга на гімнасцёрцы заходзіць у чырвонаармейскі інтэрнат.

— Таварыш старшы лейтэнант, дзяжурны па падраздзяленню чырвонаармеец Велічка!—чотка дакладвае малады баец.

— Добра дакладваеце: гучна і ўпэўнена, — заўважае камандзір.— Толькі не трымайце ўвесь час руку ля шлема. Руку трэба прыкладаць да шлема толькі ў пачатку і ў канцы дакладвання.

Старшы лейтэнант-ордэнаносец Кузьма Егоравіч Кубарэў праходзіць па інтэрнату. Тут жывуць нядаўна прыбыўшыя чырвонаармейцы. Іх ваенны стаж вылічаецца некалькімі днямі. Але не гледзячы на гэта, у інтэрнаце поўны парадак і чыстата.

Камандзір правярае запраўку ложкаў. Глядзіць, ці правільна закрыты матрацы коўдрамі, ці не зняты падушкі. Трохвугольнікамі складзены ручнік, ззяюць снежнай белізной простыні. Старшы лейтэнант астаецца задаволены аглядам і выходзіць з памяшкання. Днявальны стаіць па камандзе «смірна» і вачыма праводзіць ордэнаносца, аб баявых подвігах якога ўжо расказвалі малодшыя камандзіры.

Старшы лейтэнант Кубарэў накіроўваецца да пляцоўкі. Ідзе па ўзгорку паміж соснамі, удыхаючы мядовыя запахі восені. Здалёк чуе ён гулкія рытмічныя крокі па ўтрамбаванай зямлі.

За кароткі час навічкі дабіліся вялікіх поспехаў па страявой падрыхтоўцы.

Убачыўшы свайго начальніка, малодшы лейтэнант Чычырка падае каманду «Смірна!» і спяшаецца з дакладам.

— Прадаўжайце,—гаворыць тав. Кубарэў. Маладыя чырвонаармейцы апрануты ў новае адзенне Байцы глядзелі прама, упэўнена шагаючы ў ногу і нядрэнна робячы павароты.

З розных месц прыбылі яны, натхнёныя адзіным жаданнем: чэсна служыць радзіме, навучыцца ваеннай справе. Навучаюцца старанна, добрасумленна, усю сваю энергію аддаюць вучобе.

Перапынак. Байцы рассыпаюцца пам'ж соснамі, акружаюць свайго камандзіра.

— Не замарыліся? — клапатліва пытае камандзір.

— Не! — бойка адказвае Нікалай Пагрэбной, у мінулым калгаснік-рыбак.—Мы-ж маем таксама загартоўку. На лоўлю, бывала, выязджалі не толькі ўдзень, але і ноччу, у дождж, у дрэннае надвор'е.

— У Чырвонай Арміі гэта прыгадзіцца,—прыкмячае камандзір.

Скончан перапынак. Працягваюцца заняткі. Страявая падрыхтоўка змяняецца статутам. унутранай службы. Байцы лёгка ўсвайваюць статут. Гэтаму садзейнічае добрая агульнаадукацыйная падрыхтоўка: байцы новага папаўнення маюць адукацыю ў аб'ёме 4 — 10 класаў.

— Вельмі добрыя хлопцы, — гаворыць Кубарэву дзяжурны па часці, малодшы лейтэнант Бярэзін. — Яны падняліся сёння за чатыры мінуты. Праз пару тыдняў будуць рабіць ранішні пад'ём як даўно служачыя байцы.

Увечары байцы групіруюцца вакол камандзіра аддзялення Яштубаева.

— Раскажыце, за што вы атрымалі медаль? — просяць байцы.

— Я нічога асаблівага не зрабіў, — скромна адказвае Яштубаеў.

Але скора пад націскам акружаючых ён пачынае цікавы расказ. Гаворыць спачатку скупа, затым натхняецца. Слухачы жыва прадстаўляюць сабе сумны, занесены снегам край, спрадвечныя фінляндскія лясы, сярод якіх праходзіў фронт. Групе сапёраў, сярод якіх быў і Яштубаеў, камандаванне даручыла ўзарваць назіральную вышку белафінаў. Гэта вышка ўздымалася сярод лесу на 40 метраў ад зямлі і віднелася яна над макушкамі дрэў. З яе ворагі аглядалі акружаючую мясцовасць і па тэлефону перадавалі сваім усё заўважанае. Калі паказваліся нашы часці на дарозе, варожая артылерыя і мінамёты адкрывалі агонь, нанасілі вялікія страты. Белафінскія назіральнікі з вышкі карэктыравалі стральбу.

Пад прыкрыццём ночы падабраліся смельчакі да вышкі, заклалі ўзрыўчатую матэрыю, але яе аказалася недастаткова. Частка сапёраў пайшла за новай порцыяй толу. Ля вышкі астаўся Яштубаеў і адзін баец.

— Губляць часу нельга, ворагі могуць падыйсці, — сказаў Яштубаеў таварышу. — Трэба агледзець зарады і яшчэ раз паспрабаваць зрабіць узрыў.

Сказана — зроблена. Аглушальны ўзрыў. Вышка ўзарвана. Знішчэнне вышкі садзейнічала паспяховаму разгортванню дзеянняў нашых войск.

Уважліва слухалі маладыя чырвонаармейцы. Комсамолец Фёдар Радул гучна ўскрыкнуў:

— Эх, як шкада, што нам не прышлося паваяваць у Фінляндыі!

— Не забывайце аб капіталістычным акружэнні, — сур'ёзна адказаў камандзір аддзялення. — Калі вы не ўдзельнічалі ў баях з белафінамі, то гэта не значыць, што вам не прыдзецца біць ворагаў. Наша краіна мацнее, дзякуючы мудрай сталінскай знешняй палітыцы, але ў той-жа час мы павінны заўсёды быць гатовымі, каб адбіць любы ўдар. Нядзарма таварыш Сталін паставіў задачу «трымаць увесь народ у стане поўнай мабілізацыйнай гатоўнасці». Гэта асабліва адносіцца да нашай Чырвонай Арміі. Зразумеў тав. Радул?

— Зусім, таварыш камандзір аддзялення.

На мінуту стала ціха. Затым узнялася песня:

— Эх, бей, винтовка,
Метко, ловко,
Без пощады по врагу...

Спявалі, пакуль не прагучэў голас дзяжурнага.

— Падрыхтавацца да вячэрняй праверкі!

С. Сцяпанаў.



У Н-скую часць Заходняй асобай ваеннай акругі прыбыла новае папаўненне. З першых-жа дзён маладыя байцы ўпорна ўзяліся за вучобу. На здымку: памочнік камандзіра ўзвода В. С. Занегін (злева) аб'ясняе байцам будову ручнога кулямёта.

Фотахроніка БЕЛТА.

АГІТАТАРЫ — ЛЕПШЫЯ ПАМОЧНІКІ КАМАНДЗІРАЎ

Байцы Чырвонай Арміі штодзённа праяўляюць вялікую цікавасць да пытанняў унутранай і знешняй палітыкі Совецкага Саюза. Неабходныя звесткі аб гэтым яны атрымліваюць на палітычных інфармацыях, лекцыях і дакладах. Аднак гэтым толькі задаволіць запатрабаванні чырвонаармейцаў вельмі цяжка.

Мала разбірацца ў тым ці іншым пытанні. Трэба цесна ўвязваць пытанні агітацыі і прапаганды з штодзённым жыццём падраздзялення, часці, змагаючыся за ўмацаванне яе боездольнасці.

І ў гэтым вялікім і палітычна важным мерапрыемстве першымі памочнікамі ў камандзіраў з'яўляюцца агітатары, вылучаныя з ліку саміх чырвонаармейцаў і малодшых камандзіраў.

Вялікую сістэматычную работу вядуць агітатары ў падраздзяленнях часці, якой камандуе тав. Васільеў. З'яўляючыся перадавікамі соцыялістычнага спаборніцтва, добра дысцыплінаванымі байцамі і малодшымі камандзірамі, агітатары штодзённа праводзяць работу сярод асабовага састава сваіх падраздзяленняў, расказваюць байцам аб мерапрыемствах партыі і ўрада, загадах наркома абароны тав. Цімашэнка, накіраваных на ўмацаванне свядомай воінскай дысцыпліны. на падняцце аўтарытэта камандзіра і начальніка, на ўмацаванне боездольнасці часці.

Добра працуюць агітатары тт. Бабічаў, Кудраўцаў, Логінаў, Маркееў у падраздзяленні камандзіра тав. Пташкіна. Яны заўсёды даюць дакладныя адказы байцам і малодшым камандзірам на цікавячыя іх пытанні.

Адначасова агітатары арганізоўваюць культурна-масавыя мерапрыемствы, дапамагаючы камандзіру арганізаваць адпачынак байцоў. Калектыўная чытка газет, масавыя гульні (шашкі, шахматы, даміно), развучванне страявых чырвонаармейскіх і масавых народных песень — усё гэта не выпадае з поля зроку агітатараў.

Чырвонаармеец тав. Назаранка агітатарам у падраздзяленні працуе з пачатку гэтага года. Ён з дня ў дзень рэгулярна вядзе агітацыйную работу сярод байцоў і малодшых камандзіраў, растлумачваючы ваенную прысягу, загады наркома абароны, Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. Работай агітатара тав. Назаранка кіруе памочнік камандзіра падраздзялення па палітчасці. Ён сістэматычна дае яму указанні, парады. Азнаёміўшыся з зместам матэрыялаў газет ці журналаў, тав. Назаранка высвятляе усе незразумелыя яму пытанні ў памочніка камандзіра падраздзялення. І толькі тады, калі яму становіцца ўсё зразумелым, ён ідзе ў падраздзяленне, збірае групу незанятых работай байцоў і малодшых камандзіраў і праводзіць з імі гутарку.

3-га кастрычніка ў газеце «Правда» быў апублікаван Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах СССР. Увечары таго-ж дня тав. Назаранка дастаў гэты нумар газеты, уважліва прачытаў Указ і пастанову Соўнаркома СССР і раніцай 4-га кастрычніка перад пачаткам палітзаняткаў расказаў байцам падраздзялення аб гэтых важнейшых дакументах, растлумачыўшы іх вялікае значэнне для развіцця народнай гаспадаркі і ўмацавання абароназдольнасці совецкай дзяржавы.

Такіх агітатараў, як тав. Назаранка, у часці дзесяткі. Сваю штодзённую работу яны вядуць не толькі з групамі байцоў, але і з асобнымі байцамі, у першую чаргу з тымі, хто сам не можа самастойна разабрацца ў складаных пытаннях. Глыбокая і сістэматычная індывідуальная работа з чырвонаармейцамі дае станоўчыя рэзультаты. Сіла грамадскага ўздзеяння на недысцыплінаваных і адстаючых у вучобе байцоў хутка дае сябе адчуць. Яны, захапляючыся агульным энтузіязмам вывесці падраздзяленне ў лік перадавых, уцягваюцца ў штодзённую ўпорную работу над сабой і становяцца перадавікамі. Чырвонаармеец тав. Н. адзін час лічыўся ў падраздзяленні недысцыплінаваным, меў дрэнную паспяховасць па баявой і палітычнай вучобе. Агітатар тав. Фастоўскі пачаў з ім сістэматычна працаваць, дапамагаць яму. І тав. Н. цяпер з'яўляецца адным з лепшых байцоў у падраздзяленні. А такіх выпадкаў было многа. І ўсе яны сведчаць аб вялікай сіле ўздзеяння агітацыі.

А. Окунеў.



У Літоўскай ССР на заводах і фабрыках арганізаваны гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі.

На здымку: рабочыя шакаладнай фабрыкі ў г. Каунасе на гутарцы аб Сталінскай Канстытуцыі.

Фота ТАСС.

НАША РАДЗІМА

ЛІТОЎСКАЯ САЮЗНАЯ ССР

Мужны і свабодалюбівы літоўскі народ рука аб руку з народамі былой царскай Расіі дзесяцігоддзямі змагаўся за вызваленне ад іга памешчыкаў і капіталістаў.

У рэзультаце перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў 1918 годзе была створана Совецкая Літва. Але літоўская контррэволюцыя з дапамогай імперыялістычных інтэрвентаў патапіла ў крыві маладую соцыялістычную рэспубліку.

У Літве запанавала дыктатура катаў літоўскага народа, якія бандыцка раскрадалі народны здабытак і ператварылі ўсю краіну ў паліцэйскі засценак для працоўных.

Сялянства разаралася пад цяжарам падаткаў. Тысячы і тысячы сялян уцякалі з вёсак, ішлі па свеце. Рабочых эксплаатавалі самым наглым чынам. Беспрацоўе ахапіла не толькі вялікія слаі рабочых, але і працоўную інтэлігенцыю. Класавы прыгнёт, палітычнае самавольства цягацелі над літоўскім народам змрочным кашмарам. Незалежнасць літоўскай дзяржавы была мнімай: Літва прадстаўляла сабой жалкую зброю дыпламатычнай гульні драпежнікаў імперыялізма, падпальшчыкаў вайны. Толькі дзякуючы Совецкаму Саюзу Літва не была заняволенай белапанскай Польшчай, якая бразгала зброяй ля літоўскіх граніц і рыхтавала бясконцыя загаворы і авантуры, каб ператварыць Літву ў сваю вотчыну.

Совецкі Саюз двойчы вырваў з рук белапалякаў і звярнуў Літве яе старажытную сталіцу Вільню: у 1920 годзе, пасля разгрому белапалякаў пад Варшавай, і ў 1939 годзе, пасля вызвалення Чырвонай Арміяй нашых аднакроўных братоў у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Тым не менш абанкроціўшыяся буржуазныя правіцелі Літвы, гнусныя здраднікі сваёй радзімы, агенты імперыялістычных дзяржаў вялі супроць СССР варожую палітыку. Груба нарушаючы дагавор з СССР аб узаемадапамозе, Літва тайна ўвайшла ў антысовецкую Балтыйскую Антанту — ваенны саюз, накіраваны супроць СССР.

Нянавісцю адказваў літоўскі народ сваім прыгнятальнікам. Комуністычная партыя Літвы ні на адну гадзіну не спыняла рэволюцыйнай барацьбы. Лепшыя сыны літоўскага народа кінуты былі крывавым Сметонай і яго клікай у турмы. З трыбуны Сёмай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР выступаў член Паўнамоцнай Камісіі сейма Літоўскай рэспублікі тав. Пранас Зібертас, які прасядзеў 20 год у турэмным засценку. 20 год!

«За ўвесь час майго зняволення.—сказаў тав. Зібертас,—ні мой бацька, ні маці, ні малодшыя браты ні разу нікому не скардзіліся і мяне сваімі слязамі не жаласлівілі. Іх пролетарскага духу не зламалі перасьледаваўшыя мяне рэпрэсіі. Насупроць, яны мяне толькі падбадзёрвалі: «Трымайся, Пранас!» Гэта падтрымлівала мой дух, які падтрымлівала яшчэ і мая вера ў тое, што рана ці позна, але наш народ пры садзейнічанні і дапамозе вялікага Совецкага Саюза дабудзе сабе і Літве свабоду».

Так і здарылася. Пры садзейнічанні вялікага Совецкага Саюза народ Літвы разарваў кайданы крывавай сметонаўскай дыктатуры, узяў свой лёс у свае рукі, стаў гаспадаром свайго жыцця. На ўсенародных выбарах у Літоўскі народны сейм 14 і 15 ліпеня былі аднадушна выбраны верныя прадстаўнікі народа, за якіх галасавала звыш 99 процантаў выбаршчыкаў. Гэты сапраўдны народны сейм аднагалосна, пры ўсеагульным лікаванні працоўнага літоўскага народа, рашыў абвясціць Літву совецкай соцыялістычнай рэспублікай, прасіць Вярхоўны Совет СССР прыняць Літоўскую ССР у састаў Совецкага Саюза.

Сёмая Сесія Вярхоўнага Совета СССР пастанавіла задаволіць просьбу сейма Літвы і прыняць Літоўскую ССР у Совецкі Саюз у якасці роўнапраўнай Саюзнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Адначасова Сёмая Сесія Вярхоўнага Совета СССР, па прапанове Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, прыняла яшчэ адно гістарычнае рашэнне — аб перадачы ў састаў Літоўскай рэспублікі пагранічных тэрыторый раёнаў Беларускай ССР, у якіх пераважае літоўскае насельніцтва.

Літва стала совецкай.

Уперадзе вялікая і радасная плённая праца, праца на сябе, на свой народ, на сваю рабоча-сялянскую дзяржаву! Перад рабочым класам, сялянствам, працоўнай інтэлігенцыяй Літоўскай ССР стаяць вялікія задачы. Брацкаму літоўскаму народу прадстаіць залячыць раны, нанесеныя рэспубліцы крывавым сметонаўскім рэжымам, хутка падняць і развіць эканоміку і культуру. Задачы цяжкія, але ўдзячныя. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пры садзейнічанні і дапамозе ўрада Совецкага Саюза Літоўская ССР даб'ецца поспехаў у барацьбе за соцыялістычную перабудову ў агульнай барацьбе совецкіх народаў за комунізм.

Выражаючы пачуцці літоўскага народа, прэм'ер-міністр Літоўскай ССР тав. Палецкіс заявіў:

«Нябачаны энтузіязм, якім ахоплен літоўскі народ, ператвараецца ўжо ў творчую працу. Літоўскі рабочы і селянін ужо актыўна змагаюцца за самадысцыпліну, за ўздым вытворчасці, ужо вырысоўваюцца фігуры першых літоўскіх стаханаўцаў. Літоўскі народ хутка страсае сон, які штучна падтрымліваўся, выпростае сваю згорбленую спіну і падымаецца, каб ва ўвесь рост з горда паднятай галавой ісці па вялікаму сталінскаму шляху».

Моладзь падае заявы ў школы

КРЫНКІ. Для раз'яснення сярод насельніцтва Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб дзяржаўных працоўных рэзервах Крынкаўскі райком партыі накіраваў у калгасы і вёскі 17 камуністаў і комсамольцаў. Праведзены партыйныя сходы пярвічных арганізацый, на якіх прыняты канкрэтныя мерапрыемствы па глыбокаму раз'ясненню працоўным Ўказа.

З выключным палітычным уздымам праходзяць сходы ў калгасах, на прадпрыемствах і прамысловых арцелях раёна. На сходзе рабочых скурзавода выступіў тав. Слапак.

— Кожны з нас памятае, — сказаў тав. Слапак,—як пры ўладзе польскіх капіталістаў наша моладзь, скончыўшы 3—4 класы школы, была асуджана на беспрацоўе. Ад імені рабочых нашага завода я прынашу гарачую ўдзячнасць совецкаму ўраду і таварышу Сталіну за клопаты аб нашых дзецях.

Моладзь раёна з нецярплівасцю чакае работы раённай камісіі па прызыву ў рамесленыя, чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. Ад моладзі паступае ўжо многа заяў аб добраахвотным паступленні ў школы. З калгаса імені Стаханава падана дзве заявы.

Калгаснік калгаса імені Кагановіча, Мала-Бераставіцкага сельсовета, Міхаіл Рымарчык жадае паслаць свайго 15-гадовага сына ў рамесленае вучылішча. Ён гаворыць: «Я хачу, каб мой сын набыў кваліфікацыю. Сам я век пражыў у цемнаце. Пры совецкай уладзе з маімі дзецьмі гэтага не здарыцца».

С. Эцін.

Як будуюць дарогі ў Аўгустове

Шофер грузавой аўтамашыны, збіраючыся ехаць па дарозе Белабжыга—Магільніца—Дэмбава, загадзя прадракаў, што паездка не адбудзецца. Яго меркаванні апраўдаліся. Праехаўшы тры кілометры, машына спынілася.

Такія з'явы часта можна наглядаць на мясцовых дарогах Аўгустоўскага раёна.

У сакавіку месяцы была створана раённая камісія садзейнічання дарожнаму будаўніцтву. У яе ўвайшлі тт. Масанюк, Ханцэвіч, Бадзюгін. Гэта камісія за ўвесь сезон не палічыла патрэбным хаця-б адзін раз абмеркаваць пытанне аб ходзе дарожнага будаўніцтва.

29 мая на пасяджэнні прэзідыума райвыканкома было даручана тав. Ханцэвічу аказаць дапамогу дарожнаму аддзелу шляхам пасылкі работнікаў райвыканкома ў вёскі для масава-растлумачальнай работы. Але гэта мерапрыемства асталося на паперы. Замест дапамогі дарожнаму аддзелу праз месяц у пастанове райвыканкома запісалі: «Папярэдзіць загадчыка дарожным аддзелам, што ён не зразумеў важнасці дарожнага будаўніцтва».

Раён яшчэ не скарыстаў мясцовых планавых рэсурсаў гэтага года на суму каля 300 тысяч рублёў. А становішча дарог патрабуе жадаць многа лепшага. Ястрэмбаўскі сельсовет выканаў гадавы план дарожнага будаўніцтва на 45 процантаў, Памянскі — на 55 процантаў, Штабінскі — на 60 процантаў. Але дарожны аддзел не можа ўзяць рабочай сілы, каб закончыць будаўніцтва дарогі Штабін—Яміны, дзе булыжны брук разламваецца, бо не прысыпаны абочыны.

Раённы дарожны аддзел мае пяцітонную аўтамашыну, якую трэба было-б скарыстаць на вывазцы будаўнічых матэрыялаў, але райвыканком забірае гаручае для сваіх машын. Узята, такім чынам, 700 кілограмаў, з якіх за 400 кілограмаў з вялікімі цяжкасцямі заплацілі грошы, а за астатнія 300 кілограмаў не заплочана.

Кіруючыя работнікі раёна не прымаюць належных мер, каб хутчэй закончыць дарожнае будаўніцтва. Яны астаюцца ў ролі пабочных назіральнікаў.

М. Сідачоў.

ПРАВЯРАЕМ ВЫКАНАННЕ ЎКАЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АД 26 ЧЭРВЕНЯ

Вальготна жывецца прагульшчыкам у Граеве

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** У асобных раённых арганізацыях за апошні час павялічыўся лік нарушальнікаў працоўнай дысцыпліны. Ёсць работнікі, якія ўсімі спосабамі імкнуцца абыйсці Ўказ. Прывядзем некалькі фактаў.

Старшынёй раённага камітэта па справах фізкультуры і спорту ўжо 8 месяцаў працуе тав. Баравой. За гэты час ён арганізаваў толькі адзін фізкультурны калектыў, які праз некалькі дзён спыніў сваю дзейнасць.

7 кастрычніка тав. Баравой у рабочы час цэлы дзень хадзіў па ўстановах і прадаваў білеты на пастаноўку прыехаўшай трупы артыстаў. За распаўсюджванне білетаў атрымаў проценты. Гэта, трэба сказаць, не першы выпадак у Баравога. Калі аб гэтым сказалі сакратару райвыканкома тав. Наймарк, апошні спачатку абурыўся і абяцаў прыняць меры, а потым забыў. Баравой-жа па-ранейшаму бяздзейнічае.

24 верасня ў Венсошскай школе самавольна пакінула работу піянерважатая Іванова. Сваё адмаўленне ад работы яна матывіравала тым, што выйшла замуж. Комсамольская арганізацыя толькі 7 кастрычніка абмеркавала пытанне аб прагульшчыцы Івановай і выключыла яе з радоў ЛКСМБ. Між тым, яе справа яшчэ да гэтага часу не разбіралася ў раённым судзе. Прагульшчыца асталася беспакаранай.

Загадчыца сталовай № 2 тав. Рап скардзіцца на ўтомленасць і загружанасць у рабоце. Аднак гэта ёй не перашкаджае займацца ў рабочы час іншымі справамі. Так, 8 кастрычніка яна ў рабочы час хадзіла ў горад, шукала кватэру для прыехаўшых з вобласці ўпаўнаважаных. Калі аб гэтым даведаўся старшыня райспажыўсаюза тав. Захарчанка, ён на адным з сходаў, між іншым, заявіў: «А ў нас яшчэ ёсць і такія работнікі, якія ў рабочы час заняты пошукамі кватэр». Аднак ніякіх мер не прыняў да прагульшчыцы.

Паколькі загадчыца падае сама дрэнны прыклад, то сярод астатніх работнікаў таксама дрэнная працоўная дысцыпліна. У выніку ад працоўных паступаюць шматлікія скаргі аб дрэннай рабоце сталовай.

Аб усіх гэтых фактах у раёне добра ведаюць, але рэальных мер для ажыццяўлення Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня не прымаюць.

В. Гарбанёў.

Палепшылася работа

Да выдання Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 г. наша 25-я тэкстыльная фабрыка звычайна перад выхаднымі днямі працавала па 6 гадзін. Пасля ўступлення ў дзеянне Ўказа работа пайшла па-новаму. Па-першае, дзве гадзіны перад выхаднымі днямі намі былі скарыстаны для выпуску дадатковай прадукцыі, што дало 250 метраў тканіны ў дзень; па-другое, дзякуючы Ўказу, спынілася цякучасць рабочай сілы, ліквідаваны прастоі станкоў, сельфактараў і іншых машын.

На нашай фабрыцы за прайшоўшы час з моманту дзеяння Ўказа было чатыры прагулы. Дэзарганізатары вытворчасці пакараны. За апошні час прагулы ліквідаваны. У нас значна палепшылася якасць выпускаемай прадукцыі.

Прадзільны цэх яшчэ 5 кастрычніка выканаў сваю гадавую вытворчую праграму. Слаўную гадавіну 23-й Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыі калектыў рабочых рыхтуецца сустрэць новымі вытворчымі поспехамі. Рабочыя ўзялі на сябе абавязацельства да 4 лістапада закончыць гадавы план. Можна не сумнявацца, што сваё слова калектыў стрымае.

Г. Сальман,
статыстык 25-й тэкстыльнай фабрыкі.

Нявырашанае пытанне

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня аказаў уздзейнічанне на рабочых, якія імкнуліся браць ад прадпрыемства пабольш, а даваць яму паменш.

Сур'ёзна і дзелавіта абмяркоўваў гэты Ўказ калектыў рабочых 2-га гваздзільнага завода. Асноўная маса рабочых зразумела значэнне Ўказа, і з моманту яго апублікавання на прадпрыемстве не назіраецца ўжо ранейшага разгільдзяйства. Праўда, былі паасобныя факты нарушэння працоўнай дысцыпліны, але да вінoўнікаў прыняты меры. Калі ў ліпені, напрыклад, было 13 спазненняў на работу, то колькасць іх у наступных месяцах значна зменшылася.

30 верасня рабочы Вайцэцкі зрабіў прагул. Гэта ўжо другое па ліку нарушэнне ім працоўнай дысцыпліны. Справу аб Вайцэцкім пераслалі пракурору і гэтым абмежаваліся. На заводзе нават да гэтага часу не цікавіліся, калі яе разгледзяць.

На заводскім двары вісіць вялікая дошка, на якой запісан ход выканання плана па заводу. Але гэтыя паказчыкі гавораць аб рабоце прадпрыемства за... 21 верасня.

Нельга сказаць, што справы на гваздзільным заводзе абстаяць добра. З месяца ў месяц прадпрыемства не выконвае сваёй вытворчай праграмы. Былі месяцы, калі план выконваўся толькі на палову, а то і менш. Вераснёўская праграма выканана ўсяго на 66.1 процанта. Прычыны такой дрэннай работы дырэктар завода «шукае» ў адсутнасці рабочай сілы. Планам прадугледжана работа завода ў дзве змены. Але фактычна за апошняга часу прадпрыемства працуе толькі ў адну змену. Натуральна, што пры такім становішчы зрываецца вытворчы план.

Кіраўніцтва завода не паклапацілася ўкамплектаваць другую змену. Стварылася такое становішча, пры якім далей так працаваць стала немагчыма. І толькі з 7 кастрычніка пачала працаваць другая змена.

Калі спытаць кіраўніцтва, ці ёсць на заводзе стаханаўцы,—паследуе станоўчы адказ. І, сапраўды, на заводзе ёсць нямала рабочых, якія добрасумленна працуюць на вытворчасці. Да іх адносяцца тт. Сяргей Касінскі, Станіслаў Дэцік, Францішак Сікора і іншыя. Але норм, якія-б садзейнічалі росту прадукцыйнасці працы кожнага рабочага, на заводзе няма. Гэта, вядома, адмоўна адбіваецца на выкананні плана і стварае рэзкія скачкі ў яго выкананні. 7 кастрычніка заводам было выпушчана 1.865 кілограмаў прадукцыі, 8 кастрычніка—1.317 кілограмаў, 9 кастрычніка—1.125. У першыя тры дні 1-ай дэкады кастрычніка завод выпусціў 158 восей, а ў апошнія тры дні гэтай дэкады—97, не гледзячы на тое, што апошнія тры дні завод працаваў у дзве змены. Факт астаецца фактам—неўпарадкаванасць з нормамі выпрацоўкі моцна адбіваецца на росце прадукцыйнасці працы.

Да рэчы, аб перадавіках. Мы ўжо сказалі, што перадавікоў на заводзе нямала, але іх не прыкмячаюць. Дастаткова сказаць, што рэдактар заводскай насценгазеты не мог назваць ніводнага прозвішча стаханаўца.

Гваздзільны завод—механізіраванае прадпрыемства. Тут ёсць паравыя і пнеўматычныя молаты, ёсць кадры старых кваліфікаваных рабочых. Адсюль вывад—усё неабходнае для пладатворнай работы ёсць. Патрабуецца толькі аператыўнае кіраўніцтва з боку дырэкцыі.

На прадпрыемстве ёсць і рад нявырашаных пытанняў. Гэта ў першую чаргу адносіцца да павышэння прадукцыйнасці працы. Вырашэнне гэтай праблемы дасць магчымасць ліквідаваць недахоп рабочай сілы.

І. Апельбаум.




Лепшыя профоргі магілеўскай шоўкавай фабрыкі. Злева направа: лабарантка Н. А. Шуміга—профорг сушыльнага цэха і профоргі матальнага цэха майстры А. Е. Мірэна, М. Е. Бейлінсон і А. І. Механікава.
Фота К. Якубовіча. Фотахроніка БЕЛТА.

Высокія вытворчыя паказчыкі

Дзень апублікавання Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб пачатку выбарчай кампаніі на радзе прадпрыемстваў Беластока быў азнаменаван высокапрадукцыйнай стаханаўскай работай. Вытворчы ўздым асабліва назіраўся на 2-ім тэкстыльным камбінаце, які трымае пераходны чырвоны сцяг Трохгорнай мануфактуры. 15 кастрычніка камбінат па плану павінен быў выпусціць 4.800 метраў тканіны, выпушчана 5.042 метры. Замест плана выпуску 85 процантаў першага сорту, выпушчана 95 процантаў першасортнай прадукцыі.

Высокапрадукцыйнай работай адзначылі гэты дзень перадавыя людзі беластоцкай табачнай фабрыкі. Упакоўшчыца тав. Квятkoўская выканала норму выпрацоўкі на 223 проценты. Стары рабочы тав. Врубель даў 278 процантаў. Работніца набіўной машыны тав. Гардон дабілася найлепшай выпрацоўкі за ўвесь час яе работы на сваёй машыне. Яна выпусціла 114 тысяч штук папярос.

Выдатнымі паказчыкамі азнаменавалі гэты дзень і рабочыя ізразцоваплітачнага завода № 16. Фармаўшчык Андрэй Коўш выканаў план на 150 процантаў, яго сын Чэслаў — на 160 процантаў. Выдатных вынікаў дабіліся браты Міхаіл і Владзімір Дзелісевічы: яны далі 190 процантаў плана.



Стаханаўка гомельскай трыкатажнай фабрыкі імені 8-га сакавіка, актыўная ўдзельніца грамадскага жыцця Т. Н. Немцава, уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, выконвае норму на 135 процантаў.
Фота А. Шаевіча. Фотахроніка БЕЛТА.

Прыцягнуць да работы профсаюзаў мільённыя масы

Тысячы профсаюзных арганізацый абмеркавалі рашэнні X Пленума ВЦСПС і аднадушна адобрылі іх.

Шырокія масы рабочых і служачых, совецкай інтэлігенцыі, аб'яднаныя ў профсаюзы, разумеюць, якія сур'ёзныя, глыбокапрынцыповыя змяненні ў дзейнасці профсаюзных органаў павінны адбыцца на аснове рашэнняў X Пленума ВЦСПС.

На новую ступень узнімаецца работа профсаюзаў па комуністычнаму выхаванню мас: у ёй будзе удзельнічаць не абмяжованы круг платных работнікаў, а мільёны актывістаў аддадуць ёй свой вольны час.

Тав. Швернік у сваім дакладзе на X Пленуме ВЦСПС сказаў: «Для работы па-новаму мы маем літаральна ўсе ўмовы. Мы маем у рабочым класе і сярод нашай інтэлігенцыі велізарную колькасць выдатных людзей, здольных па-большэвіцку выконваць любую работу. Задача заключаецца ў тым, каб гэтых людзей прыцягнуць да профсаюзнай работы, арганізаваць іх, штодзённа аказваць ім канкрэтную дапамогу».

Паспяховая работа профсаюзаў па-новаму нямысліма без рашучага ўстаранення некаторых недахопаў у іх апараце, якія заключаліся ў спробах весці ўсю работу сіламі адных платных работнікаў, без прыцягнення саміх членаў саюза.

Гэтыя недахопы, з усёй паўнатой ускрытыя ў дакладзе тав. Шверніка на X Пленуме ВЦСПС, зараз ужо ў многіх профарганізацыях ліквідуюцца. Колькасць платных работнікаў рэзка скарачаецца. Так, калі ў заўкоме Верхне-Ісецкага металургічнага завода было 37 платных работнікаў, то к цяперашняму часу іх асталося 17. Апарат профсаюза рабочых чыгунак Сярэдняй Азіі скарочан на 66,6 проц. Апарат профсаюзаў рабочых бавоўназаводаў, заработная плата якога складала 129 процантаў да сумы сабраных профсаюзных членскіх узносаў, зменшан у два разы.

Скарачэнне платнага профсаюзнага апарата вызваляе велізарныя сродкі, якія пойдуць на абслугоўванне культурна-бытавых патрэб членаў профсаюзаў. Але справа не толькі ў гэтым. Велізарны сэнс перабудовы заключаецца ў тым, што яна забяспечвае паляпшэнне профсаюзнай работы на ўсіх яе ўчастках, спрыяе ўцягненню яшчэ больш шырокіх мас рабочых і служачых у актыўную шматгранную грамадскую работу, якая з'яўляецца выдатнай школай кіравання социялістычнай дзяржавай.

Іменна цесная і пастаянная сувязь з масамі, вучыў Ленін, «з'яўляецца самай важнай, самай асноўнай умовай поспеху якой-бы там ні было дзейнасці профсаюзаў» (Ленін, том XXVII, стар 153).

Можна прывесці нямала прыкладаў, якія паказваюць, як работа профсаюзных арганізацый па-новаму адкрывае мільёнам членаў саюзаў найшырэйшыя магчымасці для праяўлення сваёй актыўнасці, творчай ініцыятывы.

Заводскі камітэт Генічаскага бавоўназавода акрамя пастаянных камісій стварыў цэлы рад часовых, у якіх члены саюза выконваюць розныя даручэнні. У жніўні была створана часовая камісія па аказанню дапамогі індывідуальным забудоўшчыкам, на працягу некалькіх дзён гэта камісія дабілася праз адміністрацыю і іншыя мясцовыя органы закупкі і перавозкі 80 кубічных метраў лесу для забудовы індывідуальных дамоў і для рамонту кватэр 22 рабочых бавоўназавода. Пры тым-жа заводскім камітэце была створана часовая камісія для арганізацыі закупкі гародніны на зіму рабочымі і служачымі. Члены гэтай камісіі вялі запіс асоб, якія жадалі закупіць гародніну на зіму, а затым дагаварыліся з калгасам і арганізавалі закупку агуркоў для засолкі, капусты, паміδораў, буракоў, морквы. Трэцяя часовая камісія занялася забеспячэннем рабочых палівам на зіму. Былі апытаны ўсе рабочыя, складзены спіскі і праз адміністрацыю закуплена паліва. Гэта-ж камісія сама прасачыла за дастаўкай паліва кожнаму рабочаму па месцу яго жыхарства.

Асаблівай увагі заслугоўвае перабудова работы культурных устаноў: клубаў, бібліятэк, мастацкай самадзейнасці і т. д. Раней многія культурныя ўстановы кіраваліся невялікай групай штатных работнікаў. Гэта прывяло да таго, што клубы ператварыліся фактычна ў тэатральна-відовішчныя прадпрыемствы, а галоўнае—іх выхаваўчая функцыя, іх роля ў справе развіцця самадзейнасці рабочых і служачых выхалашчвалася.

У цяперашні час сотні клубаў ужо амаль цалкам кіруюцца сіламі грамадскасці, актывамі.

Верхне-Турынскі клуб імені III Інтэрнацыянала (Кушва, Свярдлаўскай вобласці), скараціўшы свой разбухшы апарат, здолеў прыцягнуць да работы дабравольніцкі актыў. Толькі за адзін апошні месяц гэты актыў павялічыўся на 35 чалавек. Створана пяць новых камісій, кожная з іх узначальваецца адным з членаў праўлення клуба і адказвае за пэўны ўчастак работы.

На Карасуйскім бавоўназаводзе № 8 стаў загадваць клубам грамадскі работнік слесар завода тав. Сініцын. Ён ужо вядомы на заводзе не толькі як выдатны стаханавец, але і як выдатны арганізатар грамадскай работы. Члены саюза—актывісты ў час дэманстрацыі кінокарцін і на канцэртах па чарзе дзяжураць у якасці кантралёраў, сочаць за парадкам у більярднай, у бібліятэцы клуба, замест аднаго платнага бібліятэкара зараз працуюць два актывісты.

Было нямала скептыкаў, якія цвярдзілі, што ліквідацыя платных работнікаў у гуртках мастацкай самадзейнасці прывядзе да развалу гэтых гурткоў. А здарылася наадварот: там, дзе фабрычна-заводскія і мясцовыя камітэты, праўленні клубаў па-большэвіцку ажыццяўляюць рашэнні X Пленума ВЦСПС, там павялічыўся прыток удзельнікаў мастацкай самадзейнасці і яшчэ больш актыўна сталі выяўляцца таленты і дараванні сярод радавых рабочых і служачых.

У прыцягненні новых актывістаў велізарную ролю можа адыграць профгрупорг, які бліжэй за ўсіх ведае членаў сваёй групы, штодзённа мае зносіны з імі і, значыцца, лягчэй можа вывучыць, якой галінай профсаюзнай работы цікавіцца кожны асобны рабочы і служачы. Але для таго, каб профгрупорг на самай справе стаў сапраўдным памочнікам заводскага камітэта ў пашырэнні добраахвотніцкага актыва, трэба перш за ўсё дабівацца актыўнай работы саміх профгрупоргаў.

X Пленум ВЦСПС прапанаваў, у мэтах лепшага абслугоўвання членаў профсаюзаў і падняцця работы ў профгрупах, разбуйніць іх з тым, каб у кожнай з іх было не больш 20 чалавек. Разбуйненне профгруп павялічыць рады актывістаў на тысячы новых рабочых і служачых.

Нізавыя профсаюзныя звенні павінны адчуць сапраўдную дапамогу з боку вышэйстаячых профсаюзных органаў, больш актыўна удзельнічаць у іх рабоце.

Пленум ВЦСПС рашыў ліквідаваць прэзідыумы абласных і раённых камітэтаў саюзаў, замест аддзелаў стварыць камісіі. З часу гэтага рашэння прайшло звыш двух месяцаў, але, на жаль, у многіх абласных камітэтах саюзаў перабудова праходзіць надта марудна, нерашуча, прэзідыумы ліквідуюцца з аглядкай, а камісіі ўсё яшчэ па-сапраўднаму сваёй работы не разгарнулі. Між тым, значэнне камісій пры абласных камітэтах выключна вялікае.

Прафесіянальныя саюзы стаяць перад буйнейшымі задачамі. У краіне шырока разгортваецца перадкастрычніцкае спаборніцтва. Рабочыя і служачыя змагаюцца з дня ў дзень за няўхільны рост прадукцыйнасці працы. Барацьба за социялістычную працоўную дысцыпліну стала кроўнай справай самых шырокіх мас працоўных нашай неабсяжнай радзімы. Творчая ініцыятыва нараджае кожны дзень новыя і новыя формы барацьбы за дадатковую прадукцыю, за лепшую якасць, за няўхільнае павышэнне культурна-бытавога ўзроўню працоўных.

Шырока падхоплена ў розных кутках нашай краіны ініцыятыва рабочых Глухаўскага камбіната ў стварэнні падсобных гародна-малочных гаспадарак, што несумненна дасць новыя магчымасці для паляпшэння матэрыяльнага становішча сем'яў рабочых і служачых.

У цяперашні час на прадпрыемствах, у рабочых дамах і пасёлках, у культурна-бытавых установах ідзе работа па падрыхтоўцы да зімы. Гэтай рабоце профсаюзныя арганізацыі павінны аддаваць асаблівую ўвагу, уцягваючы ў яе мільёны працоўных. Кожны член профсаюза павінен адчуць клопаты аб іх профсаюзнай арганізацыі.

Зусім ясна, што грамадская работа, якая праводзіцца ў профарганізацыях, павінна спрыяць перш за ўсё самаму галоўнаму, самаму важнаму—павышэнню прадукцыйнасці працы.

Грамадская работа, якая праводзіцца на шкоду працоўнай дысцыпліне, на шкоду прадукцыйнасці працы, з'яўляецца злачынствам перад дзяржавай, грубейшым нарушэннем Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

X Пленум ВЦСПС раз'ясніў, што рабочыя і служачыя прадпрыемстваў і ўстаноў выконваюць даручэнні профсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый толькі ў нерабочы час. Абавязак профсаюзных органаў—самым рашучым чынам змагацца супроць найменшай спробы нарушыць працоўную дысцыпліну, адцягваць рабочых у рабочы час ад вытворчасці.

Кожны член профсаюза, выконваючы сваю грамадскую работу, будзе рабіць яе добраахвотна, з любоўю, усведамляючы, што ён гэтым самым дапамагае новаму росквіту сваёй социялістычнай радзімы.

Усямернае ўмацаванне такіх іменна ідэйных адносін членаў саюза да выконваемай імі грамадскай работы будзе разам з тым сур'ёзным сродкам павышэння палітычнай актыўнасці мас і іх комуністычнай свядомасці.

Перабудова профсаюзнай работы — важная палітычная справа, накіраваная на далейшае павышэнне актыўнасці профсаюзаў СССР у барацьбе за выкананне сталінскай праграмы будаўніцтва комунізма.

ЗА РУБЯЖОМ

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 17 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе: Учора германская авіяцыя працягвала свае налёты на Лондан і іншыя раёны Англіі. У Сярэдняй Англіі на адным з ваенных заводаў узніклі пажары ва многіх цэхах і майстэрнях. Усю ноч германскія самалёты скідвалі бомбы на важныя ваенныя аб'екты Лондана. Берагавая артылерыя абстраляла ля заходняга выхада з Ла-Манша некалькі непрыяцельскіх суднаў, прабаваўшых наблізіцца да ўзбярэжжа і прымусіла іх павярнуць назад. Нашай падводнай лодкай патоплена тры непрыяцельскіх узброеных гандлёвых параходы агульным водазмяшчэннем у 21 тысячу брута-тон.

Англійскія самалёты бамбардыравалі ў ноч на 17 кастрычніка рад пунктаў Германіі, не прычыніўшы аднак страт ваенным аб'ектам. Пацярпелі жылыя кварталы розных гарадоў. Збіта 3 англійскіх самалёты. 2 германскіх згінулі без весткі.

БЕРЛІН, 17 кастрычніка. Як паведамляе Германскае інфармацыйнае бюро, учора германская авіяцыя бамбардыравала размешчаны паўднёвей Ліверпуля аэрадром. Моцна пашкоджаны 3 ангары, адзін з якіх загарэўся. Стаячыя перад ангарамі самалёты былі абстраляны кулямётным агнём.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 17 кастрычніка. Як паведамляе міністэрства авіяцыі, у ноч на 17 кастрычніка Лондан зноў з'явіўся галоўным аб'ектам германскіх атак. У некаторых раёнах горада разбураны жылыя дамы. Сярод насельніцтва ёсць забітыя. У розных пунктах было пашкоджана некалькі прамысловых прадпрыемстваў. Усе пажары былі патушаны.

Бамбардыроўка Гібралтара

НЬЮ-ЙОРК, 17 кастрычніка. Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, учора Гібралтар падвергся найбольш моцнай бамбардыроўцы ад часу атак, прадпрынятых французскай авіяцыяй 24—25 верасня.

(ТАСС).

ПРЫЁМ АНГЛІЙСКАГА ПАСЛАННІКА Ў САФІІ ЦАРОМ БАРЫСАМ

ЛОНДАН, 17 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, англійскі пасланнік у Балгарыі Рэндэл быў прыняты учора царом Барысам. Як мяркуюць, яго наведванне звязана з цяперашнімі падзеямі на Балканах.

Прыезд у Сафію германскага міністра асветы Руста

САФІЯ, 16 кастрычніка. (ТАСС). Балгарскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што сёння ў Сафію прыбыў германскі міністр асветы Руст у суправаджэнні некалькіх вышэйшых чыноўнікаў міністэрства. На вакзале ён быў сустрэт балгарскім прэм'ер-міністрам і міністрам асветы прафесарам Філавым, германскім пасланнікам і радам балгарскіх чыноўнікаў.

МУСАЛІНІ ПРЫНЯЎ БАГРАНАВА

БЕРЛІН, 16 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае Германскае інфармацыйнае бюро з Рыма, сёння Мусаліні прыняў міністра земляробства Балгарыі Багранава.

РЫМ, 16 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Стэфані, сёння балгарскі міністр земляробства і дзяржаўнай маёмасці Багранаў, які знаходзіцца ў Італіі, быў прыняты італьянскім міністрам замежных спраў Чыяна.

Рэгістрацыя ваеннаабавязаных у ЗША


НЬЮ-ЙОРК, 17 кастрычніка. (ТАСС). Учора ў ЗША пачалася рэгістрацыя ваеннаабавязаных ва ўзросце ад 21 да 36 год. Усяго яе павінны прайсці каля 16,5 мільёнаў чалавек. Да 22 гадзін па мясцоваму часу зарэгістрыравана 14 мільёнаў чалавек.

Асобы, якія прайшлі рэгістрацыю, павінны адбываць воінскую павіннасць да 15 мая 1945 года, калі мінуе тэрмін дзеяння закона аб воінскай павіннасці. Прызваныя ў армію будуць праходзіць ваенную падрыхтоўку на працягу года, а затым будуць знаходзіцца ў запасе да 45 год. У афіцыяльных кругах заяўляюць, што Рузвельт ужо назначыў мясцовыя прыёмныя камісіі, якія будуць разглядаць індывідуальныя заявы аб вызваленні ад ваеннай службы па становішчу здароўя, многасямейнасці і іншых прычынах.

ДА ЗАБАРОНЫ ВЫВАЗА МЕТАЛІЧНАГА ЛОМУ З ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 17 кастрычніка. (ТАСС). Учора ўступіла ў сілу забарона вывазу жалезнага і стальнога лому з ЗША. Як вядома, буйнейшым пакупнікам амерыканскага металічнага лому з'яўляецца Японія.

Журнал «Айрон эйдж» паведамляе, што за першыя 8 месяцаў гэтага года ЗША экспартыравалі туды звыш 662 тысяч тон лому па параўнанню з 1.286 тысяч тон за гэты-ж перыяд мінулага года.



Калгас імені Дзержынскага (Рэчыцкі раён, Гомельскай вобласці БССР) закончыў уборку бульбы і пастаўкі дзяржаве. На здымку: буртаванне бульбы на зіму.

Фота А. Шаевіча. Фотахроніка БЕЛТА.

Ліквідаваць адставанне

У Граеўскім раёне прыёмка бульбы праводзілася райспажыўсаюзам. На прыёмачныя пункты здавалі бульбу калгаснікі і аднаасобнікі. Для гэтага Райспажыўсаюз пабудаваў пераналачную пляцоўку, падрыхтаваў пляцоўку для буртоўкі бульбы. Прынята ўжо больш 50 процантаў да гадавога плана. Пасля гэтага атрымалі распараджэнне здаваць бульбу на прыёмачны пункт Грабоўскага вінзавода, які знаходзіцца на адлегласці 40 кілометраў. Ляхаўскі сельсовет знаходзіцца на яшчэ большай адлегласці. Завод да прыёмкі бульбы не падрыхтаван.

Калі здатчыкі—калгаснікі і аднаасобнікі—пачалі прывозіць бульбу на гэты пункт, то аказалася, што буртавой пляцоўкі няма, салома для буртавання бульбы не падрыхтавана, вагаў таксама няма. Сялянам прыходзіцца па некалькі разоў хадзіць, каб атрымаць грошы за зданую бульбу. Усё гэта тармозіць паспяховае выкананне бульбапаставак па раёну. І не дзіўна, што раён да гэтага часу выканаў план бульбапаставак толькі на 80 процантаў.

Азбукін.

Закончылі ўборку бульбы

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Першага мая, Монькаўскага раёна, паспяхова закончылі ўборку бульбы і выканалі план бульбапаставак. Калгас таксама закончыў ворыва зябліва.

Калгаснікі заваявалі высокі ўраджай зернавых і бульбы. Сярэдні ўраджай жыта — 13 цэнтнераў з гектара, аўса — 14 цэнтнераў, ячменю—14 цэнтнераў і каля тысячы пудоў бульбы з гектара. Па папярэдніх падліках калгаснікі атрымаюць на кожны працадзень па 7 кілограмаў зернавых і па 13 кілограмаў бульбы.

В. Гарбанёў.

Перавыконваюць нормы выпрацоўкі

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені 17 верасня, Граеўскага раёна, рыхтуюць дастойную сустрэчу ўсенароднаму святу — XXIII гадавіне Кастрычніка. На палях калгаса кіпіць дружная работа. Шырока разгорнута спаборніцтва за хутчэйшае правядзенне ўборкі бульбы. Асобныя калгасніцы на ўборцы паказваюць узоры работы. Так Галена Пшыбароўская, Міхаліна Мікуцкая, Анна Вашкевіч, Л. Тылеўская выконваюць свае нормы на 200 процантаў.

У калгасе вырашчан багаты ўраджай. Пры размеркаванні даходаў калгаснікі атрымаюць па 6 кілограмаў зернавых, 18 кілограмаў бульбы і 3 рублі грашыма на кожны працадзень.

Мароз.

Там, дзе не ступала нага чалавека

На тэрыторыі Кнаразоўскага сельсовета, Бельскага раёна, ёсць балоты, на якіх да прыходу Чырвонай Арміі не ступала нага чалавека. Вясной гэтага года быў пабудаван торфазавод. Сяляне вёсак Плоскі, Рыпнёва, Кнарозы дружна вышлі на торфараспрацоўкі. Тут працавала 150 рабочых. Дзяржаўны план па здабычы торфу ў 5 тысяч тон выканан на 150 процантаў.

Пры торфазаводзе адкрыт магазін, які забяспечвае рабочых хлебам, абуткам, мануфактурай і іншымі таварамі першай неабходнасці.

Пачалося будаўніцтва памяшкання для канторы торфазавода, сталовай і лазні. Будзе пабудаван інтэрнат для рабочых.

В. Кірылюк.

ЗВОДКА

аб ходзе ўборкі бульбы і ворыва зябліва па Беластоцкай вобласці на 10 кастрычніка 1940 года.

(У процантах да плана).

№№ п/п	Назва раёнаў	Паднята зябліва	Выкапана бульбы
1.	Аўгустоўскі	96,9	84,6
2.	Беластоцкі	85,1	89,9
3.	Бельскі	73,1	87,4
4.	Бранскі	115,0	86,8
5.	Ваўкавыскі	74,7	76,3
6.	Граеўскі	79,2	30,4
7.	Гродненскі	95,7	62,4
8.	Дамброўскі	88,5	70,4
9.	Едвабнаўскі	84,9	91,3
10.	Заблудаўскі	93,4	79,7
11.	Замбраўскі	97,9	91,5
12.	Кольнаўскі	161,5	70,4
13.	Крынкаўскі	62,0	90,5
14.	Лапскі	95,5	100,0
15.	Ломжынскі	100,5	72,8
16.	Монькаўскі	105,5	89,5
17.	Парэцкі	68,5	67,1
18.	Свіслацкі	45,9	73,3
19.	Скідэльскі	80,1	86,6
20.	Снядаўскі	100,3	95,0
21.	Сапоцкінскі	83,1	83,7
22.	Саколкаўскі	105,9	71,8
23.	Цэханавецкі	89,8	85,4
24.	Чыжаўскі	100,3	83,0
		90,5	79,6

—«о»—

Даклад аб творчасці Адама Міцкевіча

Днямі лектар Г. Вольпе прачытаў у аўгустоўскім Доме соцкультуры вельмі цікавы і змястоўны даклад аб творчасці Адама Міцкевіча. Лектар глыбока прааналізаваў усе этапы паэтычнай дзейнасці вялікага майстра слова: юнацкія годы паэта, яго жыццё ў царскай Расіі, дружбу з Пушкіным, годы ў эміграцыі. Ён даў характарыстыку літаратурнай, публіцыстычнай і палітычнай працы Міцкевіча, нястомнага змагара за прагрэс і справядлівасць. Нам быў паказан Міцкевіч такім, якім ён быў у сапраўднасці—абаронца прыгнечаных народаў, дэмакрат і інтэрнацыяналіст.

Даклад аб Міцкевічу сустрэў найжывейшы водгук, бо быў зроблены пераканаўча, дайшоў да свядомасці. Такія даклады на польскай мове вельмі пажаданы ў нашым раёне.

Л. Кофлер.

—0—

Дзяржаўная дапамога многадзетным мацерам

Днямі ў памяшканні Саколкаўскага райвыканкома адбылося ўрачыстае ўручэнне дзяржаўнай дапамогі па многадзетнасці 31 мацеры, якія маюць па 7 і больш дзяцей.

5 тысяч рублёў атрымала Юліяна Пецюль, — у яе 11 дзяцей. 4 тысячы рублёў уручана Марыяне Чэмерыс. Некалькі дзён таму назад Саколкаўскі райвыканком назначыў дзяржаўную дапамогу па многадзетнасці яшчэ 51 мацеры.

П. Тузаў.

Новыя падручнікі па польскай мове і польскай літаратуры

Польская моладзь у нашай савецкай школе мела ў апошні час вялікую радасць. Вышлі ў свет новыя падручнікі па польскай мове і польскай літаратуры амаль для ўсіх класаў. Прыгожа надрукаваныя, вельмі танныя і старанна апрацаваныя—яны заслугоўваюць пахвалы. Асабліва цікавыя падручнікі для 5, 6, 7 і 9-га класаў (для 8 і 10 класаў выйдуць у свет у бліжэйшыя дні).

Матэрыял для гэтых падручнікаў чэрпаўся са скарбаў польскай літаратурнай творчасці. Не абыйдзен ні адзін вядомы пісьменнік. У гэтых кнігах ёсць і Міцкевіч, і Славацкі, а таксама Прус, Ожэшка, Канапніцкая, Жэромскі, Оркан. З сучасных пісьменнікаў ёсць Ванда Васілеўская, Галіна Гурская. У падручніках шмат прыгожых народных песень і казак. Такім чынам, моладзь пазнаёміцца таксама з багатай народнай творчасцю, якой старая буржуазная польская школа пагарджала.

Прыгожыя песні народнага песняра Казахстана Джамбула Джабаева і таленавітага паэта Дагестана—Сулеймана Стальскага, урыўкі з аповесці гераічнага савецкага пісьменніка Нікалая Астроўскага «Як гартавалася сталь» дадуць моладзі магчымасць пазнаёміцца з багатай савецкай літаратурай.

У падручніках ёсць шмат твораў, аб якіх нічога не пісалася ў старых буржуазных падручніках (напрыклад, песні рэвалюцыйнага пралетарыята, творы прагрэсіўна-дэмакратычных пісьменнікаў, накшталт Рычарда Бервінскага або Цыпрыяна Норвіда).

Кніжкі паказваюць лёс рабочага і сялянскага дзіцяці пры капіталістычным ладзе, апісваюць класавы прыгнёт рабочага класа і сялянства, выхоўваюць у духу брацкай салідарнасці з народамі Савецкага Саюза.

Настаўнік, узброены новымі падручнікамі па польскай мове і польскай літаратуры, зможа прывіць вучням любоў да гераічнай рэвалюцыйнай барацьбы польскага народа і гордую радасць за нашую шчаслівую соцыялістычную радзіму, дзе шануецца культура кожнага народа, дзе, згодна ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, кожны можа вучыцца на роднай мове.

Г. Вольпе.

—0—

НАША ЭКСКУРСІЯ НА 1-ы КАМБІНАТ

Нядаўна наш клас хадзіў на экскурсію на 1-ы беластоцкі тэкстыльны камбінат. Там нам наладзілі добры прыём. Інжынер Палякоў паказаў нам усе аддзелы камбіната. Мы бачылі, як паступова змеска воўны і бавоўны ператвараецца ў сукно, і т. д. Сардэчна дзякуем за гасцінны прыём і жадаем калектыву камбіната далейшых поспехаў у яго рабоце.

Вучні IV «а» класа 20 беластоцкай школы.

Нам. адказнага рэдактара Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

УБ — 74. Друкарня Беластокдруку.